АДДЗЕЛ ПА АДУКАЦЫІ
КАМЯНЕЦКАГА РАЙОНАГА
ВЫКАНАНЧАГА КАМІТЭТА
**ДЗЯРЖАЎНАЯ**
**ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**«ПЕЛІШЧАНСКІ ДЗІЦЯЧЫ САД»**

вул. Першамайская, 10
225054 аг.Пелішча,
Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць,
тэл. (01631) 71-8-43
e-mail: du-pelis@kamenec.edu.by

ОТДЕЛ ПО ОБРАЗОВАНИЮ
КАМЕНЕЦКОГО РАЙОННОГО
ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА
**ГОСУДАРСТВЕННОЕ**
**УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**
**«ПЕЛИЩЕНСКИЙ ДЕТСКИЙ САД»**

ул. Первомайская, 10
225054 аг.Пелище,
Каменецкий район, Брестская область,
тел. (01631) 71-8-43
e-mail: du-pelis@kamenec.edu.by

Исх. 08 июня 2023г.
№ 05-03/11

Начальнику отдела
по образованию
Каменецкого райисполкома
Авдей Жанне Ивановне

Прошу наградить помощника воспитателя ГУО «Пелищенский детский сад», почётной грамотой отдела по образованию Каменецкого райисполкома за многолетний добросовестный труд и в связи с юбилеем (50 лет).

Заведующий
ГУО «Пелищенский детский сад»

Прокопюк И.Г.
в приказ
09.06.2023

# УЗНАГАРОДНЫ ЛІСТ

1. Прозвішча

Уласнае імя і імя па бацьку (калі такое маецца)

2. Пасада і месца работы выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячы сад № 2 г. Камянец"

3. З якога часу працуе на апошняй пасадзе з 1жніўня 1983 года

4. Стаж работы па спецыяльнасці (у галіне) 34 гады

5. Дата і месца нараджэння ., в.Дамашыцы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці

6. Грамадзянства Рэспубліка Беларусь

7. Адукацыя сярэдняя спецыяльная, Пінскае педагагічнае вучылішча, 1983 г.

8. Вучоная ступень і званне не мае

9. Якія ўзнагароды мае Ганаровая грамата аддзела адукацыі Камянецкага райвыканкама, 2006 г.; Ганаровая грамата аддзела адукацыі Камянецкага райвыканкама, 2010 г.; Ганаровая грамата аддзела адукацыі Камянецкага райвыканкама, 2013 г.; Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, 2018г., Ганаровай граматай Камянецкага райвыканкама, 2020г.

10. Дамашні адрас Брэсцкая вобласць, г.Камянец, вул. 8 Сакавіка, д. 16, кв.1

## 11.ХАРАКТАРЫСТЫКА

на пасадзе выхавальніка дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячы сад № 2 г. Камянец" працуе з 1983 года, з 2000 года арганізуе адукацыйны працэс у спецыяльнай групе для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы. Гэта вопытны педагог, якому характэрны творчы падыход да справы і ўменне працаваць мэтанакіравана, улічваючы магчымасці і здольнасці кожнага выхаванца. У групе, у якой працуе створаны спрыяльныя ўмовы для арганізацыі якаснага адукацыйнага працэсу, які яна будуе, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі навучання: праблемныя сітуацыі, "метад праектаў", што спрыяюць узбагачэнню сацыяльнага вопыту дзяцей. выхоўвае любоў у кожнага выхаванца да нацыянальнай культуры і яе традыцый. Пастаянна дзеліцца сваім вопытам работы з калегамі. Так, у 2018 годзе, падчас правядзення пасяджэння раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў-дэфектолагаў і выхавальнікаў спецыяльных груп для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы, правяла адкрыты вучэбны занятак па выкарыстанні лагарытмікі ў спецыяльнай групе. На пасяджэнні раённага вучэбна-метадычнага аб'яднання выхавальнікаў дашкольнай адукацыі выступіла з прэзентацыяй свайго праекта "Мой горад Камянец", які атрымаў высокую адзнаку сярод прысутных. У студзені 2019 года прэзентавала дадзены праект "Мой горад Камянец" удзельнікам абласнога савета загадчыкаў устаноў дашкольнай адукацыі Брэсцкай вобласці, які быў прысвечаны эфектыўным напрамкам работы па патрыятычнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту ў працэсе азнаямлення з малой радзімай, дзе таксама атрымала высокую адзнаку. У

2019 годзе . атрымала сертыфікат удзельніка абласнога фестывалю педагагічных ідэй “Размаўляем па-беларуску” і сертыфікат удзельніка рэспубліканскага фестывалю педагагічных ідэй “Каб мова родная гучала”. У 2020 годзе праект “Мой горад Камянец” (сумесная работа . і намесніка загадчыка па асноўнай дзейнасці ) прызнаны пераможцай раённага этапа рэспубліканскага конкурсу навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту “Беларусь – мая краіна! Беларусь – мая сям’я!”. Па выніках працы за 2018 і 2020 год . была занесена на раённую Дошку гонару аддзела па адукацыі Камянецкага райвыканкама. Метадычныя распрацоўкі прымалі удзел у раённым метадычным мерапрыемстве “Панарама эфектыўнага вопыту ў адукацыі Камянеччыны” і былі адзначаны дыпломам. Панараме вопыту ў 2022 годзе. Рашэннем Камянецкага раённага выканаўчага камітэта ад 05.04.2022 № 473 “Аб занясенні на Дошку пашаны Камянецкага раёна па выніках працы за 2021 год” занесена на раённую Дошку пашаны.

Значную ролю ва ўзаемаадносінах з сям’ёй адводзіць удасканаленню прававой культуры бацькоў.

. шмат увагі надае паляпшэнню і захаванню матэрыяльнай базы установы, добраўпарадкаванню і азеляненню яе тэрыторыі .

Асабістымі прафесійнымі якасцямі з’яўляюцца самадысцыплінаванасць, прынцыповасць, патрабавальнасць да сябе. Яна карыстаецца заслужаным аўтарытэтам як сярод калег, так і сярод бацькоў выхаванцаў.

12. Звесткі аб абмеркаванні ў калектыве кандыдатура абмеркавана на сходзе працоўнага калектыву дзяржаўнай установы адукацыі “Яслі-сад № 2 г. Камянца” ( пратакол ад 25.04.2022 № 2).

13. Прадстаўляецца да ўзнагароджання (Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Загадчык дзяржаўнай установы адукацыі
“Дзіцячы сад №2 г. Камянец”

Старшыня прафсаюзнага камітэта
15 верасня 2022 года

<u>Заключэнне галоўнага ўпраўлення па адукацыі абласнога выканаўчага камітэта</u>

Хадайніцтва аб узнагароджанні Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь падтрымлівае галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і Брэсцкі абласны камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

| | |
|---|---|
| Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама | Старшыня Брэсцкага абкама Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі |
| ____________Н.А.Каліноўская | ___________І.І.Васіленка |